# Тыдзень роднай мовы ў Ружанскай сярэдняй школе

Наша родная мова прыгожая, мілагучная, мяккая і ў той жа час яскравая, звонкая, пявучая. На кожны выпадак знойдзецца ў ёй трапнае слова. На гэтай мове размаўлялі нашы дзяды і прадзеды, за яе змагаліся нашы продкі.

***Сто гадоў шукай другой красы,***
***А тым больш, што свет зусім не вузкі.***
***Ды калі ты не бязродны сын,***
***Гавары са мной па-беларуску.***
***Яўгенія Янішчыц***

Кожны дзень Тыдня роднай мовы быў прадуманы да дробязей. Неабходна было, каб мерапрыемствы, з аднаго боку, не заміналі напружанаму навучальнаму працэсу, а з другога – былі змястоўнымі, карыснымі і даступнымі для кожнага ўдзельніка.
У першы дзень адкрыцця Тыдня роднай мовы вучні даведаліся аб мерапрыемствах, якія будуць праходзіць на працягу тыдня , а вучні 8-11-х класаў напісалі дыктоўку “Дзень народнага адзінства”.





Другі  дзень называўся “Гавары са мной па-беларуску”. На перапынках вучні ўдзельнічалі ў інтэрактыве “Гэтыя дзіўныя беларускія словы”.

Вельмі спадабаліся вучням пачатковых класаў рухомыя перапынкі, падчас якіх яны развучвалі беларускія народныя танцы і гульні, наведвалі школьны музей «Беларуская хатка”.



Для вучняў 8-9 –х класаў быў арганізаваны прагляд спектакляў па творах беларускіх пісьменнікаў.
З задавальненнем вучні школы прынялі ўдзел у стварэнні паштовак ”Пажаданні роднай мове”.


.

Вучні пабывалі на экскурсіі ў Белавежскай пушчы, наведалі Камянецкую вежу.






У рамках Тыдня таксама цікава прайшла творчая акцыя “Чытаем Максіма Танка разам”.



Завяршыўся Тыдзень роднай мовы марафонам ”Мова родная - мова модная”.



Тыдзень прайшоў на высокай эмацыянальнай ноце. Усе мерапрыемствы Тыдня роднай мовы, без сумнення, выклікалі высокі душэўны пад’ём і задавальненне ад далучэння да беларускай культуры праз іскрыстую творчасць дзяцей і настаўнікаў.